# КАНЦЭПЦЫЯ ДЗЯРЖАВЫ Ў ШАРЛЯ МАНТЭСК'Ё

**Я. Я. Касьцюшка**

Філасофска-ідэйным падмуркам сваіх працаў Мантэск'ё абраў *пазіцыі дэізма*, дзе Бог разглядаецца як Творца, які дзейнічае па аб'ектыўных законах матэрыяльнага свету. У асноўным творы "Аб духу законаў" Мантэск'ё паспрабаваў вытлумачыць законы і палітычнае жыццё розных краін і народаў, зыходзячы з іхных прыродных і гістарычных умоваў, у духу *тэорыі асяроддзя*. Па Мантэск'ё, "***многія рэчы кіруюць людзьмі – клімат, рэлігія, законы, прынцыпы валадарання, прыклады мінулага, норавы, звычаі; як вынік усяго гэтага утвараецца агульны "дух народа"***. "Дух народа", па Мантэск'ё, канстытуецца з законаў, звычаяў і нораваў: "Норавы і звычаі ў існе парадкі, не ўстаноўленыя законамі; законы ці не могуць, ці не хочуць устанавіць іх. Паміж законамі і норавамі ёсць тое адрозненне, што законы вызначаюць пераважна дзеянні грамадзяніна, а норавы – дзеянні чалавека. Між норавамі і звычаямі ёсць тое адрозненне, што першыя рэгулююць унутраныя, а другія – вонкавыя паводзіны чалавека". Аўтар "Аб духу законаў" выдзяляе ў якасці дзяржаватворчых канцэптаў "*прынцып*" (вызначаемы дамінуючым пачуццём у рамках канкрэтнай формы валадарання – пры дэмакратыі гэта "цнота") і "*прыроду*" (абумоўленую чыслом уладальнікаў вярхоўнай суверэннай улады: рэспубліка – увесь народ ці яго частка, манархія – адзін, але ў рамках стродкага заканадаўства, дэспатызм – адзін у адпаведнасці з уласнымі прыхамацямі і сваволяй) валадарання ва ўмовах рэспублікі, манархіі і дэспатызму.

Істотную і пазней пацьверджаную многімі даследчыкамі думку сцвердзіў Мантэск'ё аб тым, што кожны з трох тыпаў валадарання цесна карэлюе з памерамі тэрыторыі, займаемай грамадствам (чым болей абшары, тым болей шанцаў на дэспатыю). Такім чынам, Мантэск'ё звязваў уласную класіфікацыю тыпаў дзяржаўнага уладкавання з грамадскай марфалогіяй ці (па Дзюркгейму) з колькаснымі параметрамі дадзенага грамадства. Што

сімптаматычна для ідэйна- палітычных перакананняў Мантэск'ё, ён настойваў на тым, што народ прызначае гаспадара ў сілу дамовы, і гэтая дамова мусіць выконвацца; валадар прадстаўляе народ толькі так, як даспадобы народу. Да таго ж , па Мантэск'ё, няпраўда, каб упаўнаважаны меў столькі ўлады, колькі той, хто ўпаўнаважыў, і не залежаў бы ад яго. У абраным разрэзе Мантэск'ё выпрацаваў маштабную дзяржаўна- палітычную класіфікацыю, якая з дапамогай 2-х канцэптаў ("прырода" і "прынцып" валадарання) выглядае наступным чынам: *дэмакратыя* з сваім прынцыпам *цнотай; арыстакратыя – з памяркоўнасцю; манархія – з гонарам, дэспатыя – з страхам.*

Ядром палітычнай канцэпцыі Мантэск'ё стала ідэя падзелу ўладаў на заканадаўчую (як вядучую), выканаўчую і судовую, якія мусяць ўзаемна стрымліваць адна другую і ўтаймоўваць дзеля свабоды і бяспекі грамадзян. Варта прыгадаць бліскучы выраз Мантэск'ё: : "*Вядома ўжо па вопыту стагоддзяў, што ўсялякі чалавек, маючы ўладу, схільны злоўжываць ёю, і ён ідзе ў гэтым накірунку, пакуль не дасягне вызначанай яму мяжы. А памежна – хто б гэта мог падумаць! – мае патрэбу і сама цнота.* ***Каб не было магчымасці злоўжываць уладай, неабходны такі парадак рэчаў, пры каторым разнастайныя ўлады маглі бы ўзаемна стрымліваць адна другую. Магчымы такі дзяржаўны лад, пры якім нікога не будуць прымушаць рабіць тое, да чаго яго не абавязвае закон, і не рабіць тое, што закон яму дазваляе*** ".

У выкладзенай тэорыі Мантэск'ё *права сталася мерай свабоды*, і бессумніўна, *Мантэск'ё ёсць адным з пачынальнікаў усталявання прававой дзяржавы.*

У сваёй творчасці Мантэск'ё выразна выявіў дэмакратызм ідэйна-палітычных перакананняў, трапнае разуменне карэнных патрэбаў сацыяльнай эвалюцыі французскага грамадства ў Еўропе Новага часу, калі капіталістычны прагрэс станавіўся цывілізацыйнай парадыгмай.

Сутнасць вучэння Мантэск'ё палягае ў ягоных установках на эвалюцыйны шлях грамадства, а значыць аб'ектыўна і суб'ектыўна ён вылучыў і пашыраў ідэю сацыяльнага кампрамісу (найперш паміж дваранствам і буржуазіяй), накшталт такога, як у Англіі ў XVII ст. Зыходзячы з гэтай галоўнай мэты Мантэск'ё згодна сваёй метадалогіі – тэорыі асяроддзя – распрацаваў тэорыю канстытуцыйнай манархіі і падзелу ўладаў, якая стала істотным чыннікам і падмуркам ва ўсталяванні ідэй і практыкі прававой дзяржавы ў далейшай гісторыі еўраатлантычнай цывілізацыі.

Адсюль відавочнае і вялікае гістарычнае значэнне тэорыі Мантэск'ё.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ